www.Belarus-Live.eu

BELARUS Live

NEWSLETTER
15/11-22/11/07

**АФІЦЫЙНА**
▪Беларусь надасьць Малдове гуманітарную дапамогу на 100 тыс. даляраў

**ПАЛІТЫКА**
▪Санкцыі супраць канцэрну "Белнафтахім"
▪Дазвольны штамп будзе адменены, але пры ўмове...

**ЭКАНОМІКА**
▪У Беларусі – 5 банкаўскіх філіялаў на 1000 чалавек

**ГРАМАДЗТВА**
▪Моладзь выступае ў абарону беларускіх музыкаў
▪У Менску прайшла вечарына памяці рэпрэсаваных пісьменьнікаў "Калі душа заходзілася болем"

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪БСДП (Грамада) заклікае ПАРЭ ацаніць прысуд Казуліну

**КУЛЬТУРА**
▪Адменена канцэртная прэзэнтацыя новага альбому беларускага гурту "Нэйра Дзюбель"

Пэўны рэзананс у сусьветных СМІ выклікала паведамленьне, што на Генэральнай асамблее ААН трыццаць тры краіны ўнесьлі праект рэзалюцыі, якая асуджае Беларусь за парушэньне правоў чалавека.

Аўтары праекту, сярод якіх ЗША, краіны Эўразьвязу і Японія, нагадалі Менску пра гвалтоўнае зьнікненьне трох палітычных апанэнтаў прэзыдэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі ў 1999 годзе і журналіста ў 2000 годзе.

У віну Беларусі пастаўленыя ўціск і закрыцьцё няўрадавых арганізацыяў, арганізацыяў нацыянальных меньшасьцяў, незалежных сродкаў масавай інфармацыі, рэлігійных групаў, апазыцыйных палітычных партыяў, незалежных прафсаюзаў і студэнцкіх арганізацыяў. У сьпісе «перасьледаваных уладамі» фігуруе Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт, які ўлады вымусілі пераехаць зь Менску ў Вільню.

Летась Генэральная асамблея прыняла рэзалюцыю, якая асуджае Менск за парушэньне дэмакратычных свабодаў. Расея галасавала «супраць». І гэтая акалічнасьць дазволіла рэжыму Лукашэнкі фактычна праігнараваць згаданае рашэньне ААН.

Але куды большы рэзананс і магчымыя наступствы для рэжыму можа мець рашэньне адміністрацыі ЗША, якая наклала санкцыі на беларускі дзяржаўны канцэрн "Белнафтахім" з мэтай узмацніць ціск на беларускага кіраўніка, якому Вашынгтон раней забараніў уезд у краіну. У 2006 годзе Мінфін ЗША замарозіў рахункі Лукашэнкі ды іншых высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў.

Цяпер ЗША забаранілі сваім грамадзянам весьці бізнэс зь «Белнафтахімам» і замарозілі ягоныя актывы ў Амэрыцы, дзе беларускаму канцэрну належыць кампанія Belneftekhim USA Inc.

Нафтахімічны канцэрн зьяўляецца адной з «жамчужынаў» беларускай эканомікі, забясьпечваючы да 20 адсоткаў напаўненьня дзяржаўнага бюджэту Беларусі.

На думку шэрагу экспэртаў, калі ЗША здолеюць бліжэйшым часам дабіцца павышэньня ўзроўню эўраатлянтычнай салідарнасьці ў дачыненьні да рэжыму Лукашэнкі шляхам пашырэньня эўрапейскіх удзельнікаў такіх санкцыяў, то ў сукупнасьці са складанымі

адносінамі з «Газпрамам», калі зь 1 студзеня 2008 году цана для Беларусі будзе разьлічвацца паводле формулы, якая адпавядае формуле цаны пры пастаўках расейскага газу ў Эўропу, кіроўны рэжым у Беларусі можа шмат у чым рэальна пазбавіцца сваёй эканамічнай базы.

І таму Лукашэнка зноўку «запусьціў» свой мілітарысцкі козыр і атрымаў пазытыўны водгук з Масквы.

Прадстаўнік абароннага ведамства Беларусі, а ў адказ і ягоны калега з Расеі зрабілі заявы наконт плянаў разьмясьціць на беларускай тэрыторыі расейскія ракетныя комплексы «Іскандэр». Як і ў выпадку з рэзалюцыяй ААН, нягледзячы на ўсе складанасьці ў адносінах Пуціна з Лукашэнкам, у гэты раз з «Іскандэрамі», Крэмль зноўку прыйшоў на дапамогу апошняму дыктатару Эўропы. Відавочна, што ў нарастаючай напружанасьці ў Расеі, зьвязанай зь незразумелымі шляхамі сыходу з улады Пуціна, «чыньнік Лукашэнкі» можа ўзрастаць. Пра гэта сьведчаць і заявы пра варыянты асімэтрычнага адказу на разгортваньне ў Эўропе элемэнтаў супрацьракетнай абароны ЗША, якім можа быць разьмяшчэньне на тэрыторыі Беларусі расейскіх апэратыўна-тактычных комплексаў "Іскандэр". Прыцягненьню павышанай увагі да Беларусі будуць садзейнічаць і пляны Лукашэнкі пабудаваць уласную атамную электрастанцыю.

Эўрапейскаму зьвязу, асабліва ягоным чальцам-суседзям Беларусі, давядзецца прымаць больш зразумелыя рашэньні ў дачыненьні да гэтых санкцыяў ЗША.

Дзеля разуменьня эканамічнай сытуацыі ў самой Беларусі варта зазначыць тое, што ў цэлым, у цяперашні час, уплыў замежнага капіталу ў банкаўскім сэктары Беларусі ўзрастае. Няпэўнасьць на міжнародным фінансавым рынку пакуль ня робіць заўважнага адмоўнага ўзьдзеяньня на грашова-крэдытны сэктар Беларусі, але можа прывесьці да падаражаньня зьнешніх запазычаньняў, якія ажыцьцяўляюць айчынныя банкі і прадпрыемствы.

Удзельная вага замежнага капіталу ў банкаўскай сыстэме краіны без уліку «дзяржаўнай чацьвёркі» (Беларусбанк, Белаграпрамбанк, Белпрамбудбанк і Белінвэстбанк) узрасла да 56,8% на 1 верасьня супраць 54,6% на 1 жніўня.

Паводле афіцыйных дадзеных, замежны капітал прысутнічае ў статутных фондах 23 з 27 беларускіх банкаў. Пры гэтым доля расейскага капіталу ў банкаўскай сыстэме Беларусі склала 19,2% на 1 верасьня 2007 году. Далей ідуць Аўстрыя – 11%, Вялікая Брытанія – 6,8%, Кіпр – 5,8%, Украіна – 2,6%, Латвія і Швайцарыя – 2,5%, Нідэрлянды – 2,2%, Казахстан – 1,3%, Лівія і Ірляндыя – 0,8%, Багамскія выспы – 0,5%, ЗША – 0,4%.

Профільныя экспэрты папярэджваюць, што тэмпы росту фінансавага сэктару Беларусі могут крыху зьнізіцца з прычыны падаражаньня рэсурсаў на міжнародным рынку капіталу.

Што тычыцца сацыяльна-эканамічнай сытуацыі, то ўжо зразумела: той узровень жыцьця, які мы назіралі ў апошнія гады і які ўзрастаў да 2006 году – рост дабрабыту грамадзян і агульныя эканамічныя посьпехі, больш падтрымліваць немагчыма. У далейшым падтрымліваць стабільнасьць магчыма толькі за кошт росту дадатнага сальда зьнешняга гандлю. Аднак, паводле ацэнак адмыслоўцаў, становішча складаецца адваротным чынам. Пры такіх умовах падтрымліваць той жа ўзровень жыцьця, нават прадаючы дзяржаўную маёмасьць, вельмі складана. Проста такімі тэмпамі прадаваць прадпрыемствы немагчыма. Значыцца, узровень жыцьця пачне зьніжацца – гэта відавочна. І апошняя нарада ў прэзыдэнта дакладна паказала, што ва ўсім будзе віноўны цяперашні ўрад. Уяўляецца

амаль неверагодным тое, што чаканая зьмена ўраду выкліча кардынальную зьмену палітыкі афіцыйнага Менску.

## АФІЦЫЙНА

### Беларусь надасьць Малдове гуманітарную дапамогу на 100 тыс. даляраў

**Дапамога будзе выдзелена за кошт сродкаў фонду фінансаваньня расходаў, зьвязаных са стыхійнымі бедствамі.**

Як паведамляе прэс-служба прэзыдэнта, 13 лістапада Аляксандар Лукашэнка ўзгадніў пастанову Савету міністраў Беларусі аб аказаньні гуманітарнай дапамогі Рэспубліцы Малдова. Дапамога ў пераадоленьні наступстваў засухі будзе аказана па просьбе прэм'ер-міністра Малдовы Васіля Тарлева.

Беларусь накіруе ў гэтую краіну 150 тон насеннай бульбы на 55 тыс. даляраў і 100 тон насеньня азімай пшаніцы на 30,5 тыс. даляраў. Агульны кошт гуманітарнага грузу з улікам афармленьня, пагрузачных работ і дастаўкі да месца прызначэньня складзе 100 тыс. даляраў.

Дапамога будзе выдзелена за кошт сродкаў фонду фінансаваньня расходаў, зьвязаных са стыхійнымі бедствамі, аварыямі і катастрофамі. Каардынацыю працы па яе аказаньні будзе ажыцьцяўляць Міністэрства па надзвычайных сытуацыях Беларусі.

## ПАЛІТЫКА

### Санкцыі супраць канцэрну “Белнафтахім”

**Міністэрства фінансаў ЗША ўвяло санкцыі супраць канцэрну “Белнафтахім” – паведамляе партал tut.by са спасылкай на афіцыйны сайт Мінфіна ЗША.**

Замарожаныя ўсе амэрыканскія банкаўскія рахункі канцэрну й яго прадстаўніцтваў, а амэрыканскіх бізнэсмэнаў заклікаюць устрымліваца ад кантактаў з фірмай.
“Мы абвастраем санкцыі супраць Лукашэнкі й яго атачэньня, уводзячы абмежаваньні супраць буйнога канцэрну, які знаходзіцца пад кантролем уладаў,” - заявіў прадстаўнік Мінфіна ЗША Адам Шубін.

Пра намер абвастрыць санкцыі супраць Беларусі заявіў яшчэ на мінулым тыдні намесьнік памочніка дзяржсакратара ЗША Дэвід Крэмэр. Асноўнай прычынай стала невыкананьне Рэспублікай Беларусь пастаўленых перад ёй умоваў. Гэта перш за ўсё вызваленьне ўсіх палітычных вязьняў.

### Дазвольны штамп будзе адменены, але пры ўмове...

**Дзяржава абяцае з новага году адмяніць дазвольны штамп на выезд за мяжу Беларусі. Але адмена зьвязана з абмежаваньнем – павінен быць гатовы сьпіс невыязных асобаў.**

Міністэрства ўнутраных спраў распрацоўвае такую базу дадзеных. З краіны ня змогуць выехаць тыя, хто ведае важныя дзяржаўныя таямніцы, асобы, супраць якіх узбуджана крымінальная справа, людзі, якія знаходзяцца ў вышуку, не адбылі пакараньня, а таксама тыя, хто мае нейкія фінансавыя даўгі. Інфармацыя пра часова невыязных паступіць у Дзяржаўны пагранічны камітэт і далей – на ўсе прапускныя пункты на дзяржаўнай мяжы.

Дазвольны штамп на выезд за мяжу быў прызнаны неканстытуцыйным яшчэ пяць гадоў таму. Адмена штампу зацягвалася з-за адсутнасьці сьпісу часова невыязных асобаў.

## ЭКАНОМІКА

### У Беларусі – 5 банкаўскіх філіялаў на 1000 чалавек

**“Фінансы для ўсіх?” – у справаздачы з такой назвай Усясьветны банк аналізуе магчымасьці доступу людзей да фінансавых паслугаў у розных краінах сьвету.**

Доступ грамадзянаў да фінансавых інструмэнтаў моцна розьніцца ад краіны да краіны, прычым адрозьненьні – ня толькі рэгіянальныя. Скажам, у Грэцыі амаль кожны жыхар браў крэдыт у банку, у суседняй Албаніі – толькі адзін з 250 чалавек.

Паводле справаздачы, паказчык доступу насельніцтва Беларусі да фінансавых паслугаў даволі нізкі – імі карыстаюцца 16% насельніцтва. Для параўнаньня: ва Ўкраіне гэты паказчык складае 24%, у Расеі – 69%, у Польшчы – 66%, у Злучаных Штатах і Вялікай Брытаніі – 91%, а ў Сінгапуры – 98%.

Крыху лепшае становішча ў Беларусі паводле паказчыка разгалінаванасьці банкаўскай сыстэмы, а дакладней – паводле колькасьці філіялаў банкаў на 1000 чалавек насельніцтва. У Беларусі на іх прыпадае прыкладна 5 філіялаў, у Расеі – 2, у Літве – 4, у Польшчы – 8. У Злучаных Штатах на 1000 чалавек – 30 банкаўскіх філіялаў, у Нямеччыне – 50, у Гішпаніі – 95.

## ГРАМАДЗТВА

### Моладзь выступае ў абарону беларускіх музыкаў

**Моладзевыя актывісты Партыі БНФ пачалі кампанію абароны беларускамоўных музыкаў. Яны патрабуюць, каб улады не чынілі перашкодаў беларускім рок-гуртам у правядзеньні канцэртаў і фэстаў. Для гэтага юнакі і дзяўчаты зьбіраюць подпісы, каб перадаць іх у міністэрствы культуры і інфармацыі, а таксама рыхтуюць акцыі ў падтрымку музыкаў.**

Моладзевыя сябры Партыі БНФ пачалі кампанію ў абарону беларускамоўных музыкаў. Яны патрабуюць даць магчымасьць паклоньнікам музыкаў наведваць канцэрты, не баючыся, што за дзьве гадзіны да пачатку канцэрты адменяць, спаслаўшыся на тэхнічныя прычыны.

### У Менску прайшла вечарына памяці рэпрэсаваных пісьменьнікаў "Калі душа заходзілася болем"

**14 лістапада ў Менскім міжнародным адукацыйным цэнтры імя Ёханеса Рау адбылася вечарына памяці рэпрэсаваных пісьменьнікаў "Калі душа заходзілася болем". Яе арганізатарамі выступілі грамадзкі аргкамітэт па ўшанаваньні памяці ахвяр сталінізму, Саюз беларускіх пісьменьнікаў і міжнароднае грамадзкае аб'яднаньне "Белкнігазбор".**

Адкрываючы вечарыну, пісьменніца Вольга Іпатава адзначыла, што словамі верша паэта Міхася Чарота, напісанымі ім перад пакараньнем сьмерцю на сьцяне камэры ўнутранай турмы НКУС у Менску (вядомай як "Амерыканка"), "маглі сказаць аб сабе ўсе яны, закатаваныя і зьнішчаныя бязьлітасным сталінскім рэжымам".

## АПАЗЫЦЫЯ

### БСДП (Грамада) заклікае ПАРЭ ацаніць прысуд Казуліну

**У Парлямэнцкую асамблею Рады Эўропы перададзены заклік “садзейнічаць прававой ацэнцы судовага перасьледу” экс-кандыдата ў прэзыдэнты, старшыні БСДП (Грамада) Аляксандра Казуліна.**

Паводле словаў Ігара Рынкевіча, намесьніка старшыні партыі, зварот накіраваны ў рамках міжнароднай

кампаніі салідарнасьці з палітвязьнем.
У звароце нагадваецца, што падчас візыту ў Беларусь старшыня ПАРЭ Рэнэ Ван дэр Ліндэн абяцаў надаць дапамогу ў прававой ацэнцы палітычна матываваных прысудаў беларускіх дзеячоў апазыцыі.

“Беларускія ўлады аспрэчваюць існаваньне ў краіне палітычных вязьняў. Такая аўтарытэтная ўстанова, як ПАРЭ, магла б паўплываць на іх і садзейнічаць вызваленьню Казуліна й іншых вязьняў”, – кажа Ігар Рынкевіч.

Зварот перададзены ў менскі офіс АБСЭ і скіраваны ў ПАРЭ па электроннай пошце.

## КУЛЬТУРА

### Адменена канцэртная прэзэнтацыя новага альбому беларускага гурту "Нэйра Дзюбель"

**Адменена канцэртная прэзэнтацыя новага альбому беларускага гурту "Нэйра Дзюбель", якая павінна была адбыцца ўвечары 14 лістапада.**

Як паведаміў лідэр "Нэйра Дзюбеля" Аляксандр Кулінковіч, за некалькі гадзін да канцэрту з кіраўніцтвам сталічнага клюбау дзе павінна была адбыцца прэзэнтацыя, правялі гутарку супрацоўнікі КДБ, пасля чаго гурту адмовілі ў правядзеньні мерапрыемства. "Цэнзурна я пракамэнтаваць сытуацыю не магу", — сказаў А. Кулінковіч. Ён заўважыў, што, магчыма, канцэрт будзе арганізаваны ў іншым месцы ў іншы час, але "гэта ўжо ня будзе прэзэнтацыяй".

---

Belarus live

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

ERB European Radio for Belarus

polishaid

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.

Polonia POLSKIE RADIO